

Арт-лекторый

Вікторыя КУЗЬМІНА,
першы намеснік генеральнага дырэктара
Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

# МАСТАКІ ПІЛІГРЫМНЫХ ЛЁСАЎ

## БЕЛАРУСКІ КУЛЬТУРНЫ КОД У МАСТАЦКАЙ СПАДЧЫНЕ НІКАДЗІМА СІЛІВАНОВІЧА

УДК 75.071.1(476)(092) + 738.5.071.1(476)(092)

Калекцыя Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, ад часу заснавання якой сёлета спаўняецца 85 гадоў, – невычэрпная крыніца ведаў пра беларускае мастацтва ў сусветным кантэксце. Між іншых тыпаў узаемадзеяння культурных кодаў тыя транскультурныя камунікацыі, што ўзніклі як вынік уплыву адукацыйнага асяроддзя на фарміраванне адметнага мастацкага стылю выдатных майстроў мінулых эпох, уяўляюць сабой актуальны прадмет культуралагічных даследаванняў. Носьбіты нацыянальнага культурнага кода – будучыя выдатныя палітыкі, мастакі, літаратары, кампазітары – творча асэнсоўвалі веды і майстэрства іншых народаў, атрымліваючы агранку індывідуальных талентаў у пэўным культурна-асветніцкім асяродку.

Ключавыя словы: *Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, код культуры, культуралогія, мастацтвазнаўства, транскультурныя камунікацыі, традыцыйныя каштоўнасці.*

The collection of the National Art Museum of the Republic of Belarus, which celebrates its 85th anniversary this year, is an inexhaustible source of knowledge about Belarusian art in a global context. Among other types of interaction of cultural codes, those transcultural communications that arose as a result of the influence of the educational environment on the formation of a distinctive artistic style of outstanding historical figures of culture, represent an actual subject of cultural studies. Being the bearer of the national cultural code, future prominent politicians, artists, writers, composers creatively interpreted the knowledge and skills of other peoples, receiving their talent in a distinctive cultural and educational environment.

Ужо ў часы Еўфрасінні Полацкай слова *пілігрым* (з лац. *peregrīnus*) разумелася не толькі ў літаральным сэнсе – ‘іншаземец, падарожнік, вандроўнік’, але і як асаблівае паняцце, устойлівая адметная з’ява – ‘паломнік’. Хаджэнне да Святых месцаў, паломніцтва было духоўным подзвігам. Ён меў і сакральную, і экзістэнцыяльную канатацыю.

Тым часам узнік і з веку ў век умацоўваўся яшчэ адзін з найпачэснейшых подзвігаў – асветніцкі: подзвіг хаджэння ў навуку. Ён меў экзістэнцыяльныя вымярэнні, паколькі вызначаў лёс чалавека.

Сувязь чалавека з зямлёй, дзе ён нарадзіўся, бясспрэчная. І асэнсоўвацца гэтая сувязь можа з розных бакоў, што пацвярджае асацыятыўны шэраг: *Радзіма, род, народ, малая радзіма, біяграфія, лёс, пасіянарнасць, улада зямлі, Боскае наканаванне, вера.* Праз стагоддзі і тысячагоддзі многія гарады, буйныя тэрытарыяльныя супольнасці і метраполіі перажывалі ўздым, квітнелі і прыходзілі ў заняпад. Для прыкладу можна назваць Візантыю, Канстанцінопаль, Пампею і больш блізкія да нас Вільню, Тураў… Параўнальна нямногім выпала стаяць ад даўніны да сёння, не страціўшы ні статусу, ні народа, ні дзяржаўнасці.

Самі месцы калектыўнага грамадскага, духоўнага, культурнага жыцця, лакацыі сацыяльных падзей размяшчаліся аддалена. Школы і ўніверсітэты ў Заходняй Еўропе ўзніклі раней, чым ва Усходняй. У маленстве Пятра Вялікага на Русі іх яшчэ не было. Шчыльнасць адукацыйных устаноў, культурных аб’ектаў, урадавых і іншых функцыянальных будынкаў гістарычна нарастала, маючы адносіны рэферэнтнасці да хуткасных рэвалюцый у транспарце і ў камунікацыйных зносінах. Так, сёння мы маем універсітэты не толькі ў беларускіх абласных гарадах, але і ў раённых, што немагчыма было сабе ўявіць у сярэдзіне мінулага стагоддзя. А ў рэтраспектыве ў параўнанні з XX ст. стагоддзе XIX выглядае яшчэ больш раскіданым па ўзаемааддаленасці месцаў пасіянарнасці. Разрэджанасць павялічваецца па меры “вяртання” ў гісторыю.

Менавіта таму Пётр I вучыўся пад выглядам цесляра ў Галандыі караблебудаўніцтву і марской справе, цікавіўся ў Англіі ваеннай, ліцейнай тэхнікай і вытворчасцю. Францыск Скарына вывучаў філасофію ў Кракаве, а медыцыну – у Падуі, што не робіць аднаго гістарычнай асобай Галандыі ці Англіі, а другога – Польшчы ці Італіі, хоць і адпаведныя ўплывы нельга ігнараваць. А сённяшні беларускі раённы цэнтр Нясвіж у свой час быў месцам сілы незалежна ад адміністрацыйнага вылучэння. І на Вільню XIX ст. нельга глядзець вачыма XXI ст. Таксама і нацыі, і само разуменне нацыянальнасці, а тым больш самаідэнтыфікацыя творчай асобы былі яшчэ толькі ў станаўленні. Часта чалавек вызначаў сябе па рэлігіі, па суверэну, па мясцовасці.

Актуальную навуковую цікавасць уяўляюць транскультурныя камунікацыі, якія ўзнікаюць як вынік уплыву адукацыйнага асяроддзя на фарміраванне выдатных гістарычных дзеячаў культуры. З’яўляючыся носьбітамі нацыянальнага культурнага кода, будучыя выдатныя палітыкі, мастакі, літаратары, кампазітары пераймалі веды іншых народаў, судакраналіся з іншым культурным асяроддзем, што надавала агранку іх талентам.

**ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНЫ ВЫБАР МЕСЦА ПРАФЕСІЙНАГА СТАНАЎЛЕННЯ МАЙСТРА**

Адпаведна з асветніцка-культурнымі абставінамі XIX ст. таленавітая асоба, народжаная на гістарычных землях Беларусі, прыцягвалася да найлепшых і найбліжэйшых асяродкаў духоўна-пасіянарнага жыцця, якімі былі Полацк і Вільня, Пецярбург і Масква, Варшава і Кракаў. У гэтым рэгіёне, як і ў цэнтральнай і заходняй частках Еўропы, былі свае змаганні за дэфініцыі: хто і ў якім часе павінен лічыцца заканадаўцам стыляў, мод і напрамкаў. Так, напрыклад, "з канца XVII ст., калі прывабнасць Італіі крыху паблякла, сусветным заканадаўцам моды і добрага густу стала Францыя. У XIX і XX стст. французская сталіца ператварылася ў культурны цэнтр, дзе нараджаліся і ўсталёўваліся новыя кірункі жывапісу і дзе склаўся непаўторны свет, які ўяўляў сабой кірмаш мастацтва ў тым выглядзе, у якім мы ведаем яго сёння…" [1, с. 10].

Варта памятаць, што большасць беларускіх мастакоў успрымала Вільню як горад са сталічным адміністрацыйным і асветніцкім рэсурсам. Л. Дробаў пісаў: "XIX стагоддзе ў беларускім мастацтве асабліва складанае: супярэчлівае і змрочнае. Уявіце ў гэтым стагоддзі зямлю без голасу, краіну, сама назва якой забаронена…" [2, с. 5]. У Вільні ж быў універсітэт, там выдаваліся кнігі, ставіліся п'есы, гучала музыка. "Сюды цягнуцца ўсе таленавітыя, усе здольныя і з беларускай зямлі. Ім проста цесна ў досыць правінцыяльных Віцебску, Полацку, Гародні, Мінску" [2, с. 5]. І далей мастацтвазнаўца падае наступныя звесткі: "У дваццатых гадах мінулага [XIX] стагоддзя ў Мінску адна маленькая прыватная бібліятэка, дзе можна браць кнігі, у Вільні – іх шмат. У Мінску 20 тысяч насельніцтва, у Вільні – больш за 200 тысяч, прычым дзве трэці – беларусаў" [2, с. 5].

Геаграфічныя, этнічныя, рэлігійныя, моўныя каардынаты абрысаў беларускіх зямель у XIX ст. часам становяцца прадметам палкіх дыскусій. Таленавітых творцаў, народжаных у гарадах, мястэчках і вёсках Беларусі (разумеючы яе ў сучасных межах), народы-суседзі (расіяне, украінцы, літоўцы, палякі) запісваюць у шэрагі знакамітых суайчыннікаў, знаходзячы пацверджанне ў рэальных фактах іх біяграфій. Не прайшло і ста гадоў з таго часу, як Вільня была перапрапісана па-за беларускімі землямі, а ўжо не ўлічваецца, што Віленскі ўніверсітэт быў заснаваны ў 1570 г. (менш за 20 гадоў пасля смерці Ф. Скарыны) як Віленскі езуіцкі калегіум, а ў 1803 г. пераўтвораны ў Імператарскі Віленскі ўніверсітэт Аляксандрам І.

Сапраўды, народжаныя на сучасных беларускіх землях, якія пасля падзелаў Рэчы Паспалітай апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, будучыя знакамітыя мастакі, пісьменнікі, кампазітары вымушаны былі пакінуць малую радзіму, каб атрымаць адпаведную спецыяльную адукацыю ў буйных гарадах, і бывала, што так і заставаліся там назаўсёды, прыносячы гэтым цэнтрам культурна-адукацыйнага жыцця сусветную славу. У Віленскім універсітэце з 1803 да 1832 г. дзейнічалі кафедры малюнка і жывапісу, а таксама скульптуры і графікі. Атрымаць прафесійную падрыхтоўку можна было і ў знакамітай Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу, пасля 1870 г. – у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства, акрамя таго – у Кіеве, Адэсе, Варшаве. І толькі з канца XIX ст. пачалі прымаць вучняў беларускія прыватныя школы пачатковай мастацкай адукацыі – Ю. Пэна (Віцебск), Я. Кругера (Мінск), Т. Пархоменкі (Магілёў).

Разам з тым грамадскія і эстэтычныя ідэалы дзеячаў культуры суседніх краін, а ў найбольшай ступені – Расійскай імперыі, часткай якой сталі беларускія землі напрыканцы XVIII ст., заўважна паўплывалі на развіццё беларускай культурнай прасторы XIX ст. Застаючыся яшчэ ў значнай ступені на пазіцыях кансерватыўнага акадэмічнага мастацтва, працуючы ў рэчышчы рамантычнага кірунку, беларускія творцы імкнуліся прыхарашыць рэчаіснасць у сваіх творах, ідэалізуючы жыццё дробнапамеснага дваранства. Такая тэндэнцыя характэрна і для жывапісу, і для літаратурных твораў таго перыяду. Пераход да рэалістычнай вобразнай сістэмы, да змены аўтарскіх канцэпцый у жывапісе, скульптуры, архітэктуры адбываўся паступова.

Лёсы і творчасць людзей з пазіцыі такога гістарычнага шматпараметравага падыходу бачацца больш складанымі. Сучасная тэорыя культуры звяртаецца ўжо да сцвярджэння і аналізу адметных складнікаў "канцэптаў, без якіх немагчыма само вывучэнне культуры: нацыя, грамадзянін, патрыятызм, цывілізацыя, культура, адукацыя, асвета – і якія, будучы інструментам аналізу, хаваюць на самай справе небяспеку адвольнага выкарыстання, паколькі ў кожнай мове азначаюць далёка не адно і тое" [3, с. 17].

Менавіта так неабходна разглядаць і канкрэтную гістарычную творчую постаць, і канкрэтную мастацкую працу. З поўнай відавочнасцю гэта датычыцца мастака і яго твора, які паступіў у фонды Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (сёння – Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь) у снежні 1975 г.: карціна "Салдат з хлопчыкам", напісаная Нікадзімам Сілівановічам у 1867 г. у Вільні. Сёлета спаўняецца 190 гадоў з дня нараджэння нашага славутага суайчынніка, мастака і мазаіста, акадэміка Імператарскай Акадэміі мастацтваў. Большасць

жывапісных прац Нікадзіма Сілівановіча захоўваецца ў Літоўскім нацыянальным мастацкім музеі (Вільнюс), адметныя мазаічныя пано – у знакамітым Ісакіеўскім саборы (Санкт-Пецярбург).

### БЕЛАРУСКІ КУЛЬТУРНЫ КОД У СУСВЕТНАЙ ЖЫВАПІСНАЙ СПАДЧЫНЕ

У сферы беларускага мастацтва XIX ст. (дарэчы, як і ў сферы літаратуры) перад даследчыкамі стаіць пытанне прыналежнасці творчасці беларускіх майстроў да культуры краін-суседак: "Пытанне аб прыналежнасці мастака да той ці іншай культуры трэба вырашаць грунтоўна і аб'ектыўна, не абражаючы ніводзін народ недаверам" [2, с. 6].

Паўторнасць матываў роднага дома (С. Жукоўскі), прыроды і архітэктуры родных беларускіх мясцін (Н. Орда, Ф. Рушчыц), жанравых партрэтаў жыхароў вёсак і гарадоў (Н. Сілівановіч, Л. Альпяровіч) дазваляюць пазнаваць беларускія вытокі творчасці мастакоў – ураджэнцаў нашай зямлі.

Атрымліваючы вышэйшую мастацкую адукацыю ў Пецярбургу, беларускія мастакі другой паловы XIX ст. традыцыйна звярталіся да біблейскай тэматыкі (Т. Гарэцкі, Н. Сілівановіч), пісалі класічныя рэалістычныя партрэты (С. Заранка), рамантычныя пейзажы (А. Гараўскі), нацюрморты (І. Хруцкі). Гістарычнай тэме прысвечаны творы Я. Сухадольскага, у найбольш вядомых з якіх гучыць заўважны антываенны пафас ("Штурм крэпасці Ахалцых", "Пераход цераз Бярэзіну" і інш.). Паступова ў майстроў выяўленчага мастацтва, паходжаннем аб'яднаных беларускімі землямі, павялічвалася цікавасць да побытавага жанру (Н. Сілівановіч, К. Альхімовіч, Ф. Гарэцкі, В. Дмахоўскі, Л. Альпяровіч і інш.). Помнікі архітэктуры, старасвецкія сядзібы і палацы, касцёлы і манастыры, гарадскія і сельскія беларускія краявіды – улюбёныя матывы творчасці Н. Орды.

Паказальная ў гэтым сэнсе постаць таленавітага мастака **Нікадзіма Сілівановіча** (1834–1918), творчасць якога належыць адразу тром нацыянальным культурам [4, с. 90]. Нарадзіўся будучы акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў у вёсцы Цынцавічы Вілейскага павета (сёння Вілейскі раён Мінскай вобласці). Агульную адукацыю атрымаў у Маладзечне, у павятовым пяцікласным вучылішчы для дваран. Дзякуючы фінансавай дапамозе аднаго з маладзечанскіх памешчыкаў, у сям'і якога Н. Сілівановіч працаваў гувернёрам пасля вучылішча, трапіў у рысавальную школу ў Санкт-Пецярбургу, а потым – у Імператарскую Акадэмію мастацтваў, дзе праз чатыры гады атрымаў званне вольнага мастака.



***Нікадзім Сілівановіч.* Салдат з хлопчыкам.** 1867 г. Палатно, алей. *Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.*

Пабраўся шлюбам у Вільні, куды пераехаў у 1865 г. Распісваў храмы ў Лідскім павеце па запрашэнні павятовага ўпраўлення. У 1866 г. вярнуўся ў Санкт-Пецярбург, зноў вучыўся ў Акадэміі мастацтваў, на адкрытым Ф. Бруні аддзяленні мазаікі. Менавіта ў гэтым жанры Н. Сілівановіч дасягнуў найбольшага мастацкага поспеху. Мазаікі Ісакіеўскага сабора, у стварэнні якіх майстар адыграў галоўную ролю, і сёння захапляюць наведвальнікаў. За сумесную з І. Лаврэцкім працу над кампазіцыяй "Тайная вячэра" ў 1877 г. Нікадзім Сілівановіч атрымаў званне акадэміка. Набранае ім разам з М. Шчаціціным у 1888 г. мазаічнае пано "Пацалунак Іуды" па карціне К. Брулова перад устаноўкай у саборы экспанавалася і мела вялікі поспех у некалькіх еўрапейскіх гарадах: Берліне, Парыжы, Капенгагене. Кошт твора ўжо на той момант складаў значную суму – 21 тысячу рублёў [4, с. 91].

Увесь час мастак трымаў сувязь з Цынцавічамі, прыязджаў улетку на радзіму, пісаў пейзажы дарагіх сэрцу мясцін. Аўтапартрэт у саламяным капелюшы Н. Сілівановіч змясціў таксама на фоне характэрнага краявіду. Асабліва месца ў творчасці мастака займае жанравы жывапіс, героямі якога сталі насельнікі родных аўтару мясцін (карціны "Салдат з хлопчыкам", "Партрэт дзяўчынкі", "Стары пастух", "У школу",

“Дзеці ў двары”, “Партрэт жонкі”, “Партрэт сына”). У гэтых творах заўважна прамаўленне адметнага культурнага кода, кадыфікацыя базавых каштоўнасцей беларусаў: сям'я, мірнае жыццё, пераемнасць ведаў, павага да старэйшых, беражлівае стаўленне да прыроды, жывёльнага свету. (Тут можна згадаць і такі факт біяграфіі мастака – пасля смерці жонкі ўвесь цяжар выхавання чатырох дзяцей лёг на яго плечы.)

Карціна **“Дзеці ў двары”**, мяккая па каларыце, простая па кампазіцыі і сюжэце, нясе цеплыню і спакой, перадае замілаванне мастака паўсядзённым жыццём у двары сялянскай хаты сярод знаёмых прадметаў побыту (плецены кош, драўляная кадушка), побач са свойскімі жывёламі (кошка, сабака, курыца). На заднім плане – фігура жанчыны, занятай хатнімі справамі. У цэнтры карціны – хлопчык і крыху меншая за яго дзяўчынка, побач з якой ляжыць лялька і саламяны капялюш, упрыгожаны стужкай. Дзеці разбіраюць рыбалоўную сетку. Іх невялікія фігуркі вылучаны сонечным святлом. Вялікі кудлаты сабака і кошка мірна сядзяць недалёка адно ад аднаго. Усё гаворыць аб прыгажосці простага моманту жыцця, дар жыцця адчуваецца гледачамі праз разуменне сямейнага ціхага шчасця. Дзіцячыя твары выпісаны з асаблівай любоўю, з веданнем унутранага свету, душэўнага настрою маленькіх персанажаў.

Падобны зацікаўлены выраз дзіцячага твару бачым і ў героя карціны **“Салдат з хлопчыкам”**. Сюжэт твора “прачытаць” не складана. Атрымаўшы салдацкія ўзнагароды за адданую службу ў войску, на радзіму вярнуўся салдат. Немалады і, хутчэй за ўсё, адзінокі, з асаблівай пяшчотай ён паказвае цікаўнаму даверліваму хлопчыку невялікую кнігу. Героі захоплены гутаркай, шчаслівыя ад магчымасці душэўнай мірнай размовы, далёкай ад паўсядзённых клопатаў, турбот ці пакутлівых думак аб нястачы ці няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Побач з салдатам – красамоўныя і, на жаль, неабходныя асабістыя рэчы – невялічкая торба і мыліцы. Хлопчык не мае абутку. Аднак карціна ўражвае тонкай перадачай настрою герояў, веры ў добры працяг гісторыі (зялёная галінка на лаўцы побач з хлопчыкам), сонечнае святло шчодра адорвае не толькі герояў, але і гледачоў цеплынёй надзеі: “Салдат і хлопчык, які прыйшоў да яго ў госці, з захапленнем разглядваюць кнігу і вельмі шчаслівыя ад свайго занятку. Салдат таму, што знайшлося з кім раздзяліць сваю самоту, хлопчык – што атрымаў магчымасць дакрануцца да захапляльнага свету ведаў. Словам, спрадвечная тэма ўзаемаадносін старэйшага і малодшага пакаленняў… Але складваюцца гэтыя ўзаемаадносіны толькі тады, калі сілкуюцца любоўю і дабрынёй” [4, с. 92].

Нікадзім Сілівановіч быў узнагароджаны ганаровымі ордэнамі Святога Станіслава III ступені, Святой Ганны III ступені, атрымаў чын тытулярнага саветніка, яго называлі “галоўным монументалістам імперыі”. Але ў сувязі з рэзкім пагаршэннем зроку мастак вымушаны быў падаць прашэнне аб адстаўцы; ён пераехаў на радзіму жонкі, у горад Бірштаны, там правёў апошнія гады жыцця. Незадоўга да смерці вярнуўся на радзіму, у Цынцавічы, дзе і знайшоў апошні прытулак, завяршыўшы жыццёвы шлях на беларускай зямлі.

Карціна “Салдат з хлопчыкам” Н. Сілівановіча ўяўляе сабой сведчанне высокага ўзроўню рэпрэзентацыі жанравага жывапісу ў беларускім мастацтве XIX ст. Псіхалагізм, тонкае адчуванне прыгажосці ў звычайным, у імгненні паўсядзённага жыцця, майстэрства аўтара ў стварэнні рэалістычных вобразаў герояў і адпаведнай каларыстыкі дазволілі паставіць карціну ў шэраг шэдэўраў сусветнага мастацтва.

Такім чынам, XIX стагоддзе характарызавалася раскіданасцю месцаў адукацыі. Чалавек, які абіраў для сябе навучанне мастацкай справе, з неабходнасцю мусіў аддаваць сябе на хаджэнне з маленства і да сталасці, а то і цягам усяго жыцця па месцах, дзе меліся магчымасці асвойваць ступень за ступенню вяршыні майстэрства. Атрымаўшы адукацыю, рэалізаваўшы таленты жывапісцаў, мастакі пілігрымных лёсаў склалі гонар некалькіх сучасных краін і сусветнай культуры ў цэлым. Пры ўсім тым зямля, дзе творчая душа нарадзілася і пайшла ў свет, мае іманентную пячатку культурнага кода народа, з глыбінь якога яна ўздымаецца да жыцця. Пячатка тая прысутнічае ў самім творчым плёне мастака. Варта толькі ўбачыць адметныя рысы, што адгукаюцца ў сэрцы кожнага народа – спадкаемца багатай культуры творцаў XIX стагоддзя.

**Спіс літаратуры**

1. **Фелисиано, Г.** Исчезнувший музей. История хищения шедевров мирового искусства / Г. Фелисиано ; пер. с исп. Н. М. Беленькой. – М. : Слово / Slovo, 2022. – 448 с.

2. **Дробаў, Л. Н.** Беларускія мастакі XIX стагоддзя / Л. Н. Дробаў. – Мінск : Беларусь, 1971. – 114 с.

3. **Эспань, М.** История цивилизаций как культурный трансфер / М. Эспань ; пер. с франц. ; под общ. ред. Е. Е. Дмитриевой. – М. : Новое литературное обозрение, 2018. – 816 с.

4. **Гібок-Гібкоўскі, А.** Нікадзім Сілівановіч: майстар мазаікі: творчасць, якая належыць тром народам / А. Гібок-Гібкоўскі // Народная асвета. – 2011. – № 11. – С. 90–92.